Шосты дзень на пляцоўцы #КУБ

24.12.2020 - 13:51 Адукацыйная прастора

Дыстанцыйнае навучанне, анлайн-урокі і майстар-класы праз манітор камп'ютара — гэтым ужо нікога не здзівіш. Установы адукацыі сёлета вымушаны былі шукаць новыя падыходы да арганізацыі вучэбнага працэсу. А што наконт вольнага часу? Як правесці яго цікава і з карысцю, праз гульню набыць новыя веды? У Навагрудскім раённым цэнтры творчасці дзяцей і моладзі ведаюць адказ на гэтае пытанне. Адна з такіх цікавых задум — раённы google-праект па арганізацыі шостага школьнага дня "#КУБ".



Яшчэ вясной калектыў установы дадатковай адукацыі плённа працаваў над стварэннем дыстанцыйнай пляцоўкі #Сядзім_дома. Педагогі распрацавалі цыкл

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

думалі, як сумясціць такую дзейнасць са звычайнай нагрузкай, то цяпер гэта нават не абмяркоўваецца, мы працягваем здымаць майстар-класы. Ёсць яшчэ задума — падобна таму, як ствараецца рэспубліканская пляцоўка па агульнай сярэдняй адукацыі — на ўзроўні сваёй установы ўсе цыклы заняткаў з гадавой праграмы зняць на відэакамеру з адпаведнымі заданнямі для дзяцей.

Нельга не ўлічваць той факт, што сёння ў жыццё дзяцей трывала ўвайшлі розныя месенджары. А значыць, трэба выкарыстаць магчымасць звярнуцца да школьнікаў на звыклай для іх пляцоўцы. З'явіліся бацькоўскія групы і дзіцячыя чаты. Педагогі выкладваюць туды свае майстар-класы. Наладжана зваротная сувязь, дзеці дасылаюць відэа сваіх заняткаў.

— Нават калі дзеці знаходзяцца дома, мы іх бачым, яны з намі, удзельнічаюць у конкурсах, праглядаюць майстар-класы. У другую хвалю пандэміі мы не перайшлі на дыстанцыйнае навучанне, працуем па індывідуальных адукацыйных маршрутах. Высокаматываваныя школьнікі, якія рыхтуюцца да паступлення, прыходзяць у цэнтр і займаюцца з педагогамі, — дадала Алена Міклаш.

Улетку на дыстанцыйнай пляцоўцы раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі стартаваў першы google-праект #NOVOLeto. Спадабалася. У верасні быў запушчаны новы праект "#КУБ".

"Крэатыўную восень" змяніла "Паспяховая зіма". Кожная субота — тэматычная. Дзеці выконваюць розныя заданні. Так, у адну з субот снежня спявалі навагоднія песні і выстаўлялі свае відэа на платформу праекта. Такая дзейнасць раскрывае творчы патэнцыял і дапамагае дзецям пераадолець страх публічнага выступлення. І вядома ж, уражвае, захапляе выхаванцаў. Яны нават рыхтавалі касцюмы для выканання песні. Яшчэ адна субота была прававая — "Не крадзіце ў дзяцей Новы год". Школьнікі актыўна ўключыліся ў абмеркаванне, прапаноўваючы самыя розныя варыяцыі раскрыцця тэмы — ад адміністратыўных правапарушэнняў да бяспекі на вадзе.

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

сямейнымі. Дзеці звяртаюцца да бацькоў па дапамогу, каб зняць відэа, падрыхтаваць касцюм, а гэта згуртоўвае.

У Навагрудку пад дахам цэнтра творчасці дзяцей і моладзі аб'ядналі турыстычна-краязнаўчы, мастацка-дэкаратыўны, тэхнічны і эколага-біялагічны аддзелы так, што атрымалася шматпрофільная ўстанова дадатковай адукацыі. Таму цэнтр і запатрабаваны сярод дзяцей і нават дарослых. Тут заўсёды ёсць чым заняцца, было б толькі жаданне. Да таго ж, з 2017 года ўстанова размяшчаецца ў цэнтры горада.

Яшчэ адзін цікавы праект, створаны сумесна педагогамі цэнтра творчасці і дзецьмі, — пакой для маладых людзей, своеасаблівы штаб, дзе яны могуць сустрэцца, абмеркаваць нейкія ідэі. Тут працуе маладзёжны парламент Навагрудскага раёна, раённы клуб "Курс" для падлеткаў. Кожнаму даюць магчымасць заняцца цікавай справай. Неяк, як толькі клуб адкрыўся, аднаму хлопчыку тут нічога не спадабалася. Тады кіраўнік цэнтра дала яму ў рукі фотаапарат са словамі "Ты ў нас сёння будзеш фатографам". Атрымалася так, што падлетак захапіўся гэтай справай, і цяпер ён актыўны ўдзельнік прэс-цэнтра сваёй установы адукацыі.

Далёка за межамі Навагрудскага раёна шырока вядомы ўзорны ансамбль танца "Свіцязяначка". Яго ўдзельнікі займаюць прызавыя месцы на міжнародных конкурсах. Літаральна ў кастрычніку яны вярнуліся з профільнай змены НДЦ "Зубраня".

Пры цэнтры творчасці дзяцей і моладзі таксама працуе ўзорная студыя выяўленчага мастацтва "Каляровы аловак". Традыцыі, закладзеныя выкладчыкам гуртка Уладзімірам Грэкам, працягвае яго вучаніца Ганна Манекіна. Студыя вылучаецца тым, што дзеці малююць не алоўкам або акварэллю, а алейнай пастэллю. Дзеці ствараюць выдатныя карціны, многія работы публікуюцца на старонках часопісаў.

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Асаблівае месца ў цэнтры займае музей, дзе прадстаўлена гісторыя развіцця сістэмы адукацыі Навагрудчыны, гісторыя Вялікай Айчыннай вайны. Зараз тут арганізавана выстава ёлачных цацак савецкіх часоў.

А нядаўна па ініцыятыве Маладзёжнага парламента ў цэнтры быў адкрыты пакой сумеснага вольнага часу мамы і дзіцяці. На базе гэтага пакоя працуе школа ранняга развіцця “Умкі”, дзе дзеці рыхтуюцца да школы. Калі задумваўся праект гэтага пакоя, планавалі аказваць дапамогу бацькам: тут іх дзеці маглі б знаходзіцца некалькі гадзін у дзень пад наглядам вопытных педагогаў, якія праводзілі б для іх развіццёвыя заняткі. Пандэмія ўнесла свае карэктывы, аднак навагрудчане ўпэўнены: прыйдзе час і гэты пакой таксама будзе запатрабаваны.

У раённым цэнтры творчасці для дзяцей і моладзі кожны можа далучыцца да пэўнага аб’яднання па інтарэсах, уключыцца ў праектную дзейнасць і нават прапанаваць сваю ідэю. Відавочна, сумаваць тут не прыходзіцца нікому.

Ірына АНІКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Еще материалы рубрики

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

НОВОСТИ

Фруктовые соусы, десертные коктейли для детей: над какими новинками работает НПЦ НАН Беларуси по продовольствию

З гэтага года кіраўнікоў усіх устаноў дашкольнай адукацыі Гродзенскай вобласці аб’ядноўвае адпаведны савет

Сборная Беларуси стала одним из победителей в суперфинале конкурса «АгроНТРИ-2024»

Ад ідэі — да праекта: педагогі Жлобінскага раёна расказваюць пра школьныя ініцыятывы

Профилактика детского дорожно-транспортного травматизма: что нужно знать педагогам

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

НАТАЛЬЯ СТЕЛЬМАХ

БАЦЬКОЎСТВА ЯК ДАР



ИГОРЬ ГРЕЧКО

БЫЛЫХ НАСТАЎНІКАЎ НЕ БЫВАЕ



ИВАН ЖДАНОВИЧ

ГЭТЫМ ЗЯЛЁНЫМ ШЧЫТОМ...



На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Выхаваўчыя знаходкі і цікавыя распрацоўкі: педагагічныя калектывы Горацкага раёна падзяліліся эфектыўным вопытам

ШКОЛА УПРАВЛЕНИЯ

На здоровый лад

Чтобы ребенок не заболел: советы педиатра родителям в сезон простуд

©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее